# Дыдактычныя матэрыялы па фарміраванні чытацкай граматнасці

## Заключны (паслябукварны) перыяд навучання грамаце



**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Распрацаваныя дыдактычныя матэрыялы па вучэбным прадмеце “Беларуская мова (Навучанне грамаце)” адпавядаюць патрабаванням вучэбнай праграмы для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017 г.), у якой зафіксаваны патрабаванні да асобасных, прадметных і метапрадметных вынікаў [1]. Прадстаўленыя заданні прадугледжваюць фарміраванне ў вучняў метапрадметных і асобасных кампетэнцый у працэсе навучання грамаце.

Для заключнага (паслябукварнага) перыяду навучання грамаце прадстаўлены тэксты для чытання вучнямі і заданні да іх. Заданні падбіраліся з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей 6—7-гадовых дзяцей, а таксама прынцыпаў навуковасці, даступнасці, лагічнасці і паслядоўнасці.

Распрацаваныя заданні накіраваны на авалоданне вучнямі:

- лагічнымі дзеяннямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, класіфікацыі, групоўкі;
- уменнямі ўстанаўліваць узаемасувязі і заканамернасці;
- уменнямі выконваць заданні пошукавага і творчага характару;
- навыкамі сэнсавага чытання тэкстаў, пошуку ў тэксце відавочнай інфармацыі і яе апрацоўку і інш.

Пасля кожнага прадстаўленага задання адзначаецца агульнавучэбнае ўменне, якое фарміруецца ў першакласнікаў у працэсе яго выканання.

Кожны настаўнік самастойна вызначае колькасць і характар заданняў, якія будуць выкарыстаны на кожным канкрэтным уроку, зыходзячы з узроўню падрыхтаванасці вучняў, этапу вывучэння матэрыялу і асаблівасцей яго засваення вучнямі. Нягледзячы на тое што заданні распрацаваны да раздзела “Навучанне чытанню”, настаўнік можа выкарыстаць іх і на ўроках навучання пісьму пры наяўнасці часу (у якасці дадатковага задання).

Паколькі **ў I класе** навык чытання ў вучняў толькі фарміруецца, **усе заданні на ўроках фармулюе настаўнік**. Для арганізацыі работы з прадстаўленымі заданнямі педагогу трэба загадзя падрыхтаваць раздатачны матэрыял (індывідуальныя карткі для выканання заданняў, схемы сказаў, малюнкі і інш.), прадумаць сродкі зваротнай сувязі для атрымання аператыўнай інфармацыі аб выкананні заданняў. У працэсе франтальнай работы з класам дыдактычны матэрыял (малюнкі, схемы сказаў і інш.) можна дэманстраваць не толькі на класнай дошцы, але і на экране/інтэрактыўнай дошцы ці маніторах персанальных камп’ютараў вучняў. Для выканання некаторых заданняў варта наладзіць работу ў парах або групах. Рэкамендацыі па прад’яўленні заданняў і спосабах фіксацыі адказаў вучнямі прапануюцца ў каментарыях да кожнага задання.

**Заданне 1**

Прачытайце сказы. Пранумаруйце іх так, каб атрымаўся тэкст на тэму “Як лес палохае людзей”. Улічвайце, што сярод прапанаваных сказаў ёсць лішні.

- ☐ На бярозе яны ўбачылі слоік.
- ☐ У ім гудзеў калматы чмель.
- ☐ Раптам яны пачулі дзіўны і нават страшны гук.
- ☐ У траве яны ўбачылі маленькае птушаня, якое пішчала.
- ☐ Дзеці асцярожна пайшлі на гук.
- ☐ Вось так часам лес палохае баязлівых людзей!
- ☐ Дзеці разам з настаўніцай спыніліся на ўзлеску адпачыць.

*Паводле Р. Ігнаценкі*

*Правільны адказ:*

Дзеці разам з настаўніцай спыніліся на ўзлеску адпачыць. Раптам яны пачулі дзіўны і нават страшны гук. Дзеці асцярожна пайшлі на гук. На бярозе яны ўбачылі слоік. У ім гудзеў калматы чмель. Вось так часам лес палохае баязлівых людзей!

Вучні выконваюць заданне калектыўна пад кіраўніцтвам настаўніка.

*(Заданне на фарміраванне ўмення будаваць выказванне ў адпаведнасці з задачамі камунікацыі.)*

**Заданне 2**

Прачытайце загадку.

Мяч блакітны большы за зялёны
і, аднак жа, меншы за чырвоны.
Дык які тут большы з трох мячоў —
хто на гэта адказаць гатоў?

*С. Шах*

1) Знайдзіце і падкрэсліце ў загадцы назвы колераў.

*Правільны адказ:* чырвоны, блакітны, зялёны.

*(Заданне на фарміраванне ўмення знаходзіць патрэбную інфармацыю ў тэксце.)*

2) Зафарбуйце мячы алоўкамі адпаведных колераў.



*Правільны адказ:* першы мяч чырвонага колеру (самы вялікі мяч), другі — блакітнага колеру, трэці — зялёнага колеру (самы маленькі мяч).

Кожны вучань выконвае заданні самастойна на падрыхтаванай настаўнікам картцы.

*(Заданне на авалоданне лагічнымі дзеяннямі параўнання.)*

**Заданне 3**

Прачытайце загадку.

Адкажы дакладна, прама,
хто вышэйшы будзе самы
ў задачы, дзе Аксана
вышай Веры, ніжай Ганны?

*С. Шах*

1) Знайдзіце і падкрэсліце ў загадцы словы, якія запісаны з вялікай літары. Чаму гэтыя словы трэба пісаць з вялікай літары?

*Правільны адказ:* Адкажы (першае слова ў сказе), Аксана, Веры, Ганны (імёны дзяўчынак).

Адказ вучні фармулююць вусна.

*(Заданне на фарміраванне ўмення знаходзіць патрэбную інфармацыю ў тэксце; на развіццё ўмення даваць тлумачэнне на аснове ўстаноўленых прычынна-выніковых сувязей.)*

2) Пад кожным малюнкам напішыце літару, з якой пачынаецца імя дзяўчынкі.



*Правільны адказ:* А (Аксана), В (Вера меншая за ўсіх), Г (Ганна вышэйшая за ўсіх).

Кожны вучань выконвае заданне самастойна на картцы.

*(Заданне на авалоданне лагічным дзеяннем параўнання.)*

**Заданне 4**

Прачытайце тэкст.

У Чалавека было дзесяць верных памочнікаў. Як пачне пра іх расказваць, не нахваліцца:

— Якія ў мяне добрыя памочнікі! Усё яны ўмеюць. Трэба было — дом збудавалі. Захацеў агарод ускапаць — калі ласка! А потым і дрэвы пасадзілі.

— А ці дружна памочнікі жывуць? — запыталіся ў Чалавека.

— Дружней за іх у свеце не знойдзеш, — усміхнуўся той. — Кожную работу разам робяць. Адзін аднаму дапамагаюць. А прыходзіць зіма — дзясяцера два футры апранаюць. І задаволеныя, бо разам цяплей...

— А ў цябе ёсць такія памочнікі? Як іх завуць?

1) Злучыце "рассыпаныя" літары, каб атрымаўся адказ на пытанне, змешчанае ў канцы казкі.

| п | ц |
|---|---|
| л | ь |
| а | ы |

*Правільны адказ:* пальцы.

*(Заданне на развіццё ўмення аналізаваць інфармацыю, прадстаўленую ў тэксце, выкарыстоўваць яе для рашэння практычнай задачы.)*

2) Абвядзіце ў тэксце словы, якія з'яўляюцца доказам таго, што памочнікі ў Чалавека працавітыя.

*Правільны адказ:* дом збудавалі; захацеў агарод ускапаць — калі ласка; дрэвы пасадзілі.

*(Заданне на развіццё ўмення знаходзіць у тэксце канкрэтныя звесткі, прадстаўленыя ў відавочным выглядзе, якія з'яўляюцца доказам сцвярджэння.)*

3) Падкрэсліце ў тэксце сказы, якія пацвярджаюць, што памочнікаў Чалавека можна назваць сябрамі.

*Правільны адказ:* Кожную работу разам робяць. Адзін аднаму дапамагаюць. А прыходзіць зіма — дзясяцера два футры апранаюць.

*(Заданне на развіццё ўмення знаходзіць у тэксце канкрэтныя звесткі, прадстаўленыя ў відавочным выглядзе, якія з'яўляюцца доказам сцвярджэння.)*

4) У якім значэнні ўжываецца слова *футра* ў тэксце? Адзначце правільны адказ.

☐ шэрсць
☐ зімовая вопратка

*Правільны адказ:* зімовая вопратка.

*(Заданне на развіццё ўмення тлумачыць значэнне слова з апорай на кантэкст.)*

5) Памочнікі ў Чалавека працавітыя і дружныя. Хто на самай справе кіруе такімі памочнікамі? Запішыце адказ.

*Правільны адказ:* Чалавек.

*(Заданне на інтэрпрэтацыю інфармацыі, фарміраванне ўмення адказваць на пытанні, выкарыстоўваючы інфармацыю, пададзеную не ў яўным выглядзе (падтэкставую).)*

6) Выберыце і адзначце назву, якая ў большай ступені адпавядае зместу тэксту.

☐ Памочнікі Чалавека
☐ Дружныя і працавітыя памочнікі
☐ Памочнікі

*Правільны адказ:* Дружныя і працавітыя памочнікі.

*(Заданне на развіццё ўмення падбіраць загаловак да тэксту.)*

*ЛІТАРАТУРА*


1. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання : 1-шы кл. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 106 с.
2. Ігнаценка, Р. У зімовым садку : апавяданні / Р. У. Ігнаценка. — Мінск : Юнацтва, 1981. — 23 с.
3. Птушка шчасця : зб. казак : для малод. шк. узросту / маст. В. І. Валынец. — Мінск : Юнацтва, 1991. — 175 с.
4. Шах, С. М. Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапам. для лагапедаў / С. М. Шах. — Мінск : Нар. асвета, 1998. — 95 с.




*На дыску — карткі з заданнямі.*


**Кампетэнтнасны падыход**



**Беларуская мова**
**Навучанне грамаце**
Н. М. Антановіч

**Літаратурнае чытанне**
Н. М. Антановіч,
Г. М. Федаровіч



**Мова — наша спадчына**
**Дадатковыя практыкаванні**
Н. М. Антановіч
**3 клас. І паўгоддзе**
**3 клас. ІІ паўгоддзе**



**Дыктанты і спісванні па беларускай мове**
**2–4 класы**
Н. М. Антановіч,
Н. У. Антонава



**Правілы беларускай мовы ў табліцах і схемах**
**2–4 класы**